# Прадмова

Нумар, які чытач трымае ў руках — ужо другі з новай серыі «ARCHE», прысвечанай аглядам сучаснай беларускай гуманітарыстыкі і замежнай беларусістыкі. У ім вы знойдзеце крытыку таго, што пішацца ў Беларусі (а значыць адлюстроўвае навуковыя кампетэнцыі, светапогляд і жыццёвую пазіцыю беларускай інтэлігенцыі), а таксама таго, што пішацца пра Беларусь за мяжою.

Трэба сказаць, у нас яшчэ досыць слаба выпрацаваная культура навуковага рэцэнзавання. Нельга не ўзгадаць існуючы ад 1994 г. «Беларускі гістарычны агляд», які з'яўляецца добра пазнавальным брэндам айчыннай гістарычнай інтэлектуалістыкі. Пэўныя крокі ў гэтым кірунку робіць часопіс «Палітычная сфера», Агенцтва гуманітарных тэхналогій ды яшчэ некалькі рэсурсаў.

Разам з тым, рыхтуючы гэты нумар, мы перагледзелі вялікую колькасць свежых навуковых выданняў, апублікаваных беларускімі ўніверсітэтамі. На жаль, за вельмі рэдкімі выключэннямі там стаіць абсалютная цішыня. Рэдкія агляды і рэцэнзіі звычайна носяць павярхоўна-апісальны і ў абсалютнай большасці хвалебны характар. Відавочная прырода іх паўстання — работнікі акадэмічнай сферы займаюцца ўзаемным прыкрыццём. Згаданыя вышэй незалежныя выданні, безумоўна, чытаць цікавей, але ж яны нярэдка пакутуюць на неапраўданае крытыканства. Наогул якасць аглядаў прапарцыйная кампетэнцыі іх аўтараў, і з-за няздольнасці апошніх трымаць высокую рэдакцыйную планку ў тым ліку незалежным выданням досыць складана. Атрымліваецца пакуль што страката.

Другая праблема — гэта боязь пісаць аб'ектыўныя агляды. Чытач нумару абавязкова зверне ўвагу на тое, што большасць аўтараў, якія напісалі рэцэнзіі адмыслова для «ARCHE» — ніяк не інстытуалізаваныя ў Беларусі. Той, хто мае акадэмічны статус, стараецца не крытыкаваць сваіх калег у Беларусі. Тыя беларускія аўтары, якія ўсё ж наважыліся на крытыку, абралі для гэтага ў асноўным замежныя даследаванні пра Беларусь.

Трэцяя праблема ў тым, што беларускія навукоўцы заматаныя бягучай працай. Яны па сутнасці ўжо перасталі быць прафесійнымі даследчыкамі ў першасным сэнсе гэтага слова. Ад іх патрабуюць чытаць лекцыі ды ладзіць семінарскія шмат гадзін на дзень. Ад іх патрабуюць самаакупальнасці. Усё,

што яны робяць у навуцы, яны робяць у свой вольны час. Вось таму навуковая чытальная зала ў Нацыянальнай бібліятэцы — і так не надта вялікая памерам — часцей за ўсё пустая або напаўпустая.

Механізм выбара таксама варта патлумачыць асобна: рэдакцыя не раздавала кніжкі на рэцэнзаванне. Мы проста прапаноўвалі навукоўцам пісаць пра тое, што ў апошні час найбольш іх узрушыла.

Сярод вядомых і даўніх аўтараў «ARCHE» пагадзіліся напісаць тэксты Сяргей Астанковіч, Эмануіл Іофе, Аляксей Каўка, Аляксандр Пагарэлы, Пётра Садоўскі, Генадзь Семянчук, Іна Соркіна, Аляксей Шота. Але ж большасць аўтараў нумару — маладыя, амбітныя навукоўцы, яшчэ не надта «раскручаныя». Свае першыя публікацыі ў «ARCHE» пабачаць Цімох Акудовіч, Зміцер Бадзевіч, Фарыд Беррашэд, Раман Воранаў, Віктар Кахновіч, Аляксандр Кур'яновіч, Андрэй Ралёнак, Сяргей Сурыновіч. Да новых у «ARCHE» імёнаў таксама адносяцца Андрэй Лаўрухін і Сяргей Траццяк. Кожны з іх досыць паспяхова працуе на ўласнай дзялянцы, з якой і абралі кніжкі для рэцэнзавання. Прысутнасць вялікай колькасці новых аўтараў, якія выступаюць менавіта ў жанры рэцэнзіі, якраз сведчыць аб пераломе пакаленняў у беларускай гуманітарыстыцы. Дзевяць аўтараў нумару працуюць за мяжою.

Змест нумара атрымаўся рознапланавым. Тут ужо традыцыйна для «ARCHE» пераважаюць агляды перадусім гістарычнай літаратуры. Вялікая частка тэкстаў прысвечана культур-антрапалагічным выданням — падобныя даследаванні ў Беларусі сёння набываюць папулярнасць, таму даследчыкі ўсё больш увагі звяртаюць на такія выданні. Не абыйшлося і без агульнагуманітарных тэмаў — так, у нумары прадстаўлены ўніверсітэцкія, урбаністычныя, сацыялагічныя, паліталагічныя і філалагічныя даследаванні. Цяжка вылучыць найлепшыя тэксты — спадзяёмся, для кожнага з чытачоў цікавым будзе нешта сваё.

Добрым вынікам гэтага нумару мог бы стаць працяг дыскусіі па ўзгаданых тут праблемах айчыннай гуманітарыстыкі і сусветнай беларусістыкі. Кампетэнтныя навукоўцы, натхняйцеся і пішыце нам свае якасныя агляды!

*Сцяпан Стурэйка*